Источник: "Наша слова" - 2013-09-18

# 450-гадовы юбілей “Берасцейскай біблії”

4 верасня 2013 года ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа адбылася прэзентацыя выставы “450-годдзе Берасцейскай біблії”.

Найкаштоўнейшыя старадрукаваныя кнігі захоўваюцца ў фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі. Найстарэйшыя з іх “пражылі” больш за 500 гадоў, іншыя яшчэ набліжаюцца да такога паважнага ўзросту. Сярод іх - “Берасцейская біблія”, якой 4 верасня споўнілася 450 гадоў. Да нашага часу дайшло каля 40 асобнікаў гэтага знакамітага выдання, якія ў сілу гістарычных абставінаў захоўваюцца ў кнігасховішчах Расіі, Польшчы, Літвы, і толькі адзін - на радзіме, у Беларусі.

Выданне польскамоўнага перакладу Святога Пісання было ідэяй магната Вялікага Княства Літоўскага Мікалая Радзівіла Чорнага. На здзяйсненне сваёй мэты ён не пашкадаваў грошай - 10 тысяч дукатаў. Кніга выйшла ў свет у Берасцейскай друкарні ў 1563 годзе накладам больш за 500 асобнікаў. Пасля смерці Мікалая Радзівіла Чорнага частка кніг трапіла ў бібліятэку Віленскага евангелісцка-рэфармацкага сінода. Сярод іх быў і асобнік, што захоўваецца ў ЦНБ НАН Беларусі.




*Канвер “Белпошты” да 450-годдзя “Берасцейскай біблії”*

Наведвальнікі бібліятэкі змогуць пабачыць гэты рарытэтны асобнік, адчуць прыгажосць яго мастацкага афармлення, даведацца пра асабісты лёс кнігі. На розныя пытанні можна было атрымаць адказы айчынных навукоўцаў: Аляксандра Сцефановіча і Алены Яцыны. Разам з асобнікамі “Берасцейскай біблії” выстаўлены даследванні айчынных і замежных навукоўцаў.

На мерапрыемстве прысутнічала творчая інтэлігенцыя г. Менска (журналісты, гісторыкі і краязнаўцы.) Было вельмі цікава.

***Аляксей Шалахоўскі.***

Аляксей Шалахоўскі. 450-гадовы юбілей "Берасцейскай Біблії"